HISTORICAL-ARCHEOLOGICAL COLLECTION № 14

# ГІСТАРЫЧНА-АРХЕАЛАГІЧНЫ ЗБОРНІК

## № 14



МІНСК 1999

## МАТЭРЫЯЛЫ І ДАСЛЕДАВАННІ

**АБУХОЎСКІ В.** *(Варшава)*

### РАСКОПКІ СТАЯНКІ БЕРШТЫ VI

Першыя звесткі пра старажытныя паселішчы з ваколіц вёскі Берашты вядомы з першай чвэрці XX стагоддзя.(Birkner, 1923). Аўтар гэтай публікацыі спрабуе даць параўнальную характарыстыку каменных прылад працы, знойдзеных прафесарам Сцехавым на тэрыторыі Літвы, з падобнымі знаходкамі вядомымі з Заходняй Еўропы. Пасля Другой Сусветнай вайны археалагічныя разведкі на берагах возера Берштаўскага праводзілі Л.С.Клейн (Л.С.Клейн, 1958) і М.М.Чарняўскі (М.М.Чарняўскі 1967, 1994). Паселішча Берашты VI выявіў і правёў збор пад'ёмнага матэрыялу М.М.Чарняўскі ў 1994 г. У ліпені 1997 г. аўтарам з дапамогай студэнтаў гістарычнага факультэта Гр.ДзУ на помніку былі праведзены невялікія археалагічныя раскопкі.

Стаянка размешчана на паўднёва-заходнім беразе возера на адлегласці 300 м на поўнач ад в. Бераставіца Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці і займае 5—7 мятровую пясчаную азёрную тэрасу (мал.5). Паласа са знаходкамі мае шырыню 20-30 метраў і цягнецца прыкладна на 250 метраў на поўнач у бок выступа паўвострава. Амаль уся тэрыторыя стаянкі парастае лесам, таму нешматлікі паверхневы матэрыял удалося выявіць у асноўным на лясной дарозе і ў абрыве тэрасы. Раскоп плошчай 18 м$^2$ быў закладзены ў паўднёвай частцы паселішча.

Стратыграфія ўсіх сценак раскопу мае падобны склад і прадстаўляецца наступным чынам:

0—0,05 – сучасная лясная глеба;

0,05—0,2/0,25 – цёмна-шэры пясок (культурны пласт?);

0,20/0,25—0,3 – пераходны пласт паміж цёмна-шэрым пяском і светла-жоўтым пяском з украпленнямі артзандаў;

0,3—0,6 – светла-жоўты пясок з украпленнямі артзандаў.

Культурныя рэшткі залягалі на глыбіні да 0,3 м. Раскопкі вяліся па мятровых квадратах пластамі ў 10 см.

Падчас раскопак было выяўлена 746 артэфактаў, у тым ліку: крамянёвых вырабаў – 555, керамікі – 190 фрагментаў (56 фрагментаў эпохі неаліту пачатку бронзавага веку, 134 фрагменты – XVI—XVIII стст.) Ступень насычанасці знаходкамі механічных пластоў характэрна для гэтага тыпу помнікаў. У першым механічным пласце (0—0,1 м) знойдзена 157 артэфактаў (118 крамянёвых вырабаў, 37 фрагментаў керамікі эпохі позняга сярэднявечча, 2 фрагменты ляпной керамікі), у другім (0,1—0,2 м) колькасць іх павялічваецца да 463 (335 крамянёвых вырабаў, 96 фрагментаў керамікі эпохі позняга сярэднявечча, 32 фрагменты ляпной керамікі неаліту пачатку бронзавага веку), і ў трэцім (0,2-0,3 м) зноў змяншаецца да 119 адзінак (97 крамянёвых вырабаў, 1 фрагмент керамікі эпохі позняга сярэднявечча, 21 фрагмент ляпной керамікі эпохі неаліту пачатку бронзавага веку).

Тыпалагічны аналіз крамянёвага інвентару і ляпной керамікі дазволіў вылучыць некалькі этапаў засялення тэрыторыі паселішча першабытным чалавекам ад фінальнага палеаліту да пачатку бронзавага веку. Хацелася б адразу адзначыць, што сярод вырабаў з другаснай апрацоўкай значную частку складаюць прылады працы з нявызначанай храналогіяй: рэтушаваныя адшчэпы (мал.3: 10—12, 14), зламаныя пласцінкі з фрагментарычнай рэтушшу (мал.3; 1-3, 13, 15), рабрыстая пласцінка мікрарэтушаваная на адным краі з брушка (праколка?) – (мал. 3: 9), некаторыя формы скрабкоў (мал. 3: 4—6), таму да асобных культурна-храналагічных комплексаў закваліфікавана толькі найбольш характэрныя формы.

**Фінальны палеаліт.** Гэты перыяд зазначаны вельмі невыразна і прадстаўлены толькі двума прыладамі – разцамі, якія маюць найбольш архаічныя рысы. Адзін з іх – двухгранны сіметрычны (мал.2: 7) выкананы са зламанай пласціны, другі – двухгранны бакавы на пласцінчатым адшчэпе (мал. 2: 6). І ў адным і ў другім выпадку нарыхтоўкі да прадукцыі разцоў сколаты з двухпляцовачных монафрантальных нуклеўсаў для пласцін.

**Мезаліт.** Са змешанага крамянёвага інвентару стаянкі Берашты VI мезалітычны комплекс выдзяляецца найбольш пэўна. Тыпалагічны аналіз прылад працы дае падставы залічыць гэты матэрыял да паўночна-янiславiцкай культуры (K.Szymczak,1995), якая належыць да янiславiцкай культурнай вобласці.

Янiславiцкiх вастрый знойдзена 4 экземпляры і адзін абломак з захаванай верхавінай (мал. 1: 5). Усе яны выкананы з рэгулярных пласцін, а верхавіны фармаваліся тэхнікай мікраразцовага скола. Тры вастрыі маюць абламаныя падставы (мал.1: 3—5). У адным выпадку падстава мае стромую рэтуш (мал. 1: 4). Сярод найцікавейшых знаходак трэба адзначыць два ланцэтападобныя вастрыі (мал. 1: 6—7). У адрозненні ад янiславiцкiх вастрый яны маюць вельмі далікатную рэтуш і захаваную натуральную падставу. Не відочны таксама сляды стасавання мікраразцовай тэхнікі. На жаль у літаратуры прадмету падобныя формы не выдзяляліся раней у асобную групу. Аналогіі вядомы галоўным чынам з тэрыторыі Літвы - Кампішкес, Няцесяй 1 (сярэдні пласт), Дзярэжніча 15 і другіх паселішч з матэрыламі познемезалітычнага часу (Римантене, 1971). Янiславiцкi трохкутнік з адламанай вяршыняй у калекцыі адзін (мал.1: 8). Таксама адным экземплярам прадстаўлена пласцінка з прытупленай спінкай (мал.1: 9). Адносна вялікую групу складаюць пласцінкі-укладышы (мал.1: 10—16). Частка з іх мае рэтушаваны адзін край. Да паўночна-яснiславiцкай культуры можна залічыць таксама канцавы скрабок на зламанай пласціне (мал.1: 20), рэтушны бакавы разец (мал 1: 18), пашкоджаны разец на вуглу зламнай пласцінкі (мал. 1: 19), серыю скрабачоў на адшчэпах

(мал.1: 25—30), дзве перапаленыя пласцінкі са скошаным рэтушшу канцом (мал. 1: 22, 23), фрагмент мікраліта неакрэслены (мал. 1: 17), сячэнне пласцінкі са скоблепадобнай выемкай (мал. 1: 24). Адыходам ад вытвочасці яніславіцкага вастрыя з'яўляецца мікраразец (мал. 1: 21). Мезалітычныя рысы маюць некаторыя вельмі рэгулярныя зламаныя пласцінкі.

**Неаліт, бронзавы век.** Гэтыя два перыяды выдзелены галоўным чынам на падставе керамікі. Крамянёвы інвентар вельмі невыразны і прадстаўлены адзінкавымі характэрнымі формамі. Гэта перапаленая, зламанная нарыхтоўка наканечніка стралы (?) або рэжучая прылада, якая мае паўстромкую рэтуш падставы і плоскую на адным краі з брушка (мал. 3: 8). Часам неаліту пачаткам бронзавага веку трэба датаваць зламаную пласцінку знойдзеную ў яме №1 (мал. 3: 16).

Неалітычныя кераміка адзначаецца шчыльнымі, моцнымі сценкамі і дамешкай пяску і дробнай жарствы ў цесце. Арнамент у выглядзе наколаў размяшчаўся ў гарызантальных паясах (мал. 4: 1).

Кераміка бронзавага часу даволі значна адрозніваецца ад неалітнай. Яна больш крохкая і мае дамешку буйнай жарствы ў цесце. Арнамент складаецца з наколаў і адбіткаў лінейнага штампа (мал. 4: 2—5).

На помніку выяўлены 4 нуклеусы (мал. 2: 1—3, 5) і адзін масіўны скол з нуклеуса (мал. 2: 4), аднак з-за моцнай спрацаванасці культурную прыналежнасць іх вызначыць вельмі цяжка.

Такім чынам, на стаянцы Берштты VI атрыманы змешаны інвентар на падставе якога можна выдзеліць не менш як чатыры культурна-храналагічныя комплексы – фінальнапалеалетычны, мезалітычны (паўночна-яніславіцкая культура), неалітычны (нёманская культура) і раннебронзавы (культура шнуравой керамікі).

ЛІТАРАТУРА

Клейн Л.С. Стоянки каменого века, обследованные славяно-литовским отрядом Прибалтийской экспедиции (отчет за 1958 г.) — Архіў ІГ ГАГБ, спр. № 178.

Чернявский М.М. Отчет об археологических исследованиях за 1967 г. в северо-западной Белоруссии. — Архіў ІГ НАНБ, спр. № 317.

Чарняўскі М.М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у летні сезон 1994 г. на тэрыторыі Гродзенскай вобласці. — Архіў ІГ НАНБ, спр. № 1520.

Римантене Р.К., 1971..Палеолит и мезолит Литвы. Вильнюс.

Birkner F., 1923. Steinzeitliche Funde aus Litauen. München.

Szymczak K., 1995. Epoka kamienia Polski Północno-Wschodniej na tle środkowoeropejskim. Warszawa.




Мал. 1. Крамянёвы інвентар са стаянки Бершты VI



Мал.. 2. Крамянёвы інвентар са стаянки Бершты VI




Мал. 3. Крамянёвы інвентар са стаянкі Бершты VI




Мал. 4. Керамічны матэрыял са стаянкі БерштыVI




Мал. 5. Сітуацыйны план стаянкі Бершты VI